Источник: "Рэспубліка" - 2017-08-23

БЕЗ ШУМУ І ВЫХЛАПУ



Новая станцыя валодае максімальнай магутнасцю 50 кВт і прызначана для экспрэс-зарадкі электрамабіляў на працягу 15—50 хвілін.

# ТОК ІМ І ТРЭБА

**На ажыўленай трасе М-6 Мінск — Гродна — мяжа Рэспублікі Польшча з'явілася першая станцыя для падзарадкі электрамабіляў.**

Новая станцыя знаходзіцца недалёка ад міжнароднага пункта пропуску «Брузгі», на 291-м кіламетры шляху. У бліжэйшыя гады ў Гродзенскай вобласці плануецца адкрыць каля дзясятка такіх станцый. Устанаўліваць іх будзе ВА «Беларуснафта».

Новая станцыя мае максімальную магутнасць 50 кВт і прызначана для экспрэс-зарадкі электрамабіляў на працягу 15—50 хвілін. Зарадка магчымая па стандартах Mode-4 і Mode-3, па трох раздымах — пастаянным токам CHAdeMO і Combo-2 CCS, пераменным токам пад раздым Type 2 AC. Пакуль станцыя працуе ў тэставым рэжыме, што дазваляе ўладальнікам электрамабіляў падзараджацца бясплатна.

Галоўны энергетык ВА «Беларуснафта» Вячаслаў Цэрэн гаворыць пра паступовае стварэнне інфраструктуры для «зялёных» аўтамабіляў:

— Казаць пра бізнес пакуль не выпадае. Працуем, хутчэй, на стварэнне іміджу і на перспектыву. Прынамсі, пакуль заканадаўча не будзе прынята сістэма спагнання аплаты. Такія запраўкі могуць спатрэбіцца ўладальнікам электрамабіляў, якія ідуць праз Беларусь транзітам. У многіх краінах гэты напрамак запатрабаваны і набірае абароты. Да прыкладу, Нарвегія з'яўляецца лідарам па колькасці электрамабіляў. У Гродне ўсяго 3 электракары. Экспрэс-запраўкі такога тыпу ўстанаўліваюцца, як правіла, на міжнародных трасах. У горадзе для прыватных асоб прадугледжаны запраўкі, разлічаныя на больш доўгі час. Размяшчэнне станцыі ў «Брузгах» прадугледжана планам развіцця станцый хуткай зарадкі для пакрыцця асноўных транзітных дарог нашай краіны. У кожнай вобласці будзе з'яўляцца па адной станцыі ў год. У Гродзенскай вобласці ў 2018 годзе яшчэ адна запраўка для электрамабіляў з'явіцца ў Зэльвенскім раёне на АЗС № 31.

Станцыя для зарадкі электрамабіляў у «Брузгах» зроблена ў Іспаніі. Яе кошт складае 22 тысячы еўра.

**Пакуль станцыя працуе ў тэставым рэжыме, што дазваляе ўладальнікам электрамабіляў падзараджацца бясплатна**

Развіццё сэрвісу па зарадцы электрамабіляў з'яўляецца вельмі актуальным кірункам, які будзе набіраць абароты. У планах да 2020 года — паставіць 40 зарадак для электрамабіляў. У гэтым годзе закуплена 12 станцый, якія ўстановяць у розных кутках краіны. У будучыні адлегласць паміж імі будзе каля 200 кіламетраў. Плануецца паступова «закрыць» усе асноўныя міжнародныя магістралі і пасажырапатокі.

**Таццяна КАНДРАЦЬЕВА**
Tanula.K@mail.ru

**ДАРЭЧЫ**

**Нацыянальная акадэмія навук прэзентавала першы наш электрамабіль. Эксперыментальны ўзор створаны на базе серыйнай машыны GeelySC7 беларускай зборкі.**

